ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ ПА АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА
АБЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

# М а т э р ы я л ы

**першага (школьнага) этапу Рэспубліканскай алімпіяды**
**<u>па вучэбных прадметах</u>**
**<u>“Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”</u>**
**для вучняў XI класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2018/2019 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2018

**Водгук на мастацкі твор**

**XI клас**

Генадзь Бураўкін

***

Я не ганю землі чужыя, –
Хай іх сонца не абміне.
Толькі дзе б за морам ні жыў я,
Беларусь мая снілася мне.

Так карцела – сляза закіпала, –
Каб да сэрца хаця б здалёк
Прыплывалі жалейка Купалы,
Багдановічаў васілёк...

Гэта ўсё, безумоўна, не нова.
А ці трэба, каб новым было
Поле бацькава, матчына мова
І над хатай буслова жытло?

Хіба душы свае не лечым
Ад бяздомных бядот і згрызот
Самым простым і самым вечным,
Што пранёс праз вякі народ?

І якія б шляхі ні схадзіў я,
Кліча полацкая сенажаць...
А калі не спяваць аб Радзіме,
Дык навошта наогул спяваць?

**I (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**XI клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | ***Усяго*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | **50** |

**Заданне 1.** Запішыце словы ў фанетычнай транскрыпцыі.

*(Максімальная колькасць балаў – **5**)*

| Слова | Транскрыпцыя | Слова | Транскрыпцыя |
|---|---|---|---|
| раз’езджаны | | схілены | |
| утрымаешся | | падцісне | |
| счарсцвелы | | мундзір | |
| без солі | | супрацьдымны | |
| пад ігліцай | | не едзеш | |

**Заданне 2.** Ад прапанаваных слоў утварыце зборныя назоўнікі. Запішыце і графічна абазначце словаўтваральны сродак.

*(Максімальная колькасць балаў – **6**)*

| | |
|---|---|
| Пяро → | бюракрат → |
| ракушка → | дзеці → |
| лаза → | студэнт → |

**Заданне 3.** У правы слупок табліцы запішыце словы-паронімы, якія адрозніваюцца ад папярэдніх толькі адной літарай.

*(Максімальная колькасць балаў – **4**)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| гумар | | бялізна | |
| адолець | | вечка | |
| пачуванне | | вышка | |
| акраец | | газ | |

**Заданне 4.** Ад прапанаваных словазлучэнняў утварыце і запішыце складаныя прыметнікі.

*(Максімальная колькасць балаў – **4**)*

| | |
|---|---|
| Устойлівы да цяпла – | |
| добрае сэрца – | |
| глыбокія думкі – | |
| тоўстыя крылы – | |
| дзвесце гадоў – | |
| падобны да шкла – | |
| восемсот тысяч – | |
| небяспечны агонь – | |

**Заданне 5.** Запішыце беларускія адпаведнікі.

*(Максімальная колькасць балаў – **5**)*

| | |
|---|---|
| Страдать почками | |
| прислониться к стене | |
| обоих влюблённых | |
| не говорить об этом | |
| благодарить мать | |

**Заданне 6.** Складзіце з кожным словам па два сказы: у першым сказе ўжывайце слова ў ролі самастойнай часціны мовы, у другім – у ролі прыназоўніка.

*(Максімальная колькасць балаў – **6**)*

*Абапал, паблізу, упоперак.*

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Заданне 7.** Вызначце тып даданых частак складаназалежных сказаў. Укажыце, што выступае сродкам сувязі паміж даданай і галоўнай часткамі.

*(Максімальная колькасць балаў – **6**)*

| Сказ | Тып даданай часткі | Сродак сувязі |
|---|---|---|
| Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! | | |
| Ніякая навука не дае агню вачам і жывога румянцу шчокам, калі халодная душа дрэмле ў прамоўцы. | | |
| Сапраўдным настаўнікам можа быць толькі чалавек, які самаахвярна аддае душэўнае багацце і веды людзям. | | |
| Дакладчыкі распавядалі пра свае справы, гаварылі, як будуць працаваць далей. | | |
| Няма для мяне нічога лепшага на свеце, як хадзіць па грыбных мясцінах і збіраць баравікі. | | |
| Ужо надвечар таго дня, калі дзед Талаш спаткаўся з Мартынам Рылем каля тоўстага дуба, людзі з вёскі Вепры заўважылі адзнакі нейкай нядобрай праявы. | | |

**Заданне 8.** Запішыце назвы выдзеленых мастацкіх сродкаў выразнасці.

*(Максімальная колькасць балаў – **4**)*

| | Мастацкі сродак выразнасці |
|---|---|
| Снег над родным краем, гурбы, **як пярына**, а ў двары спявае салавейка з гліны. *(У. Мацвеенка)* | |
| Дзед нясе ўнуку мёд. Следам – **пчолаў карагод**. *(В. Шніп)* | |
| Любіце птушак… Ім, зімовым, у школе прысвяцілі ўрок. Кармілі ласкай, **цёплым** словам | |

| | |
|---|---|
| сінічак, галубоў, сарок. *(М. Маляўка)* | |
| Строгі ў яго [пеўня] пагляд. Ён – **настаўнік куранят**. *(В. Шніп)* | |

**Заданне 9.** Пададзены прозвішчы беларускіх пісьменнікаў. Замест пропускаў запішыце іх імёны.

*(Максімальная колькасць балаў – **5**)*

| Імя | Прозвішча | Імя | Прозвішча |
|---|---|---|---|
| | Багдановіч | | Рымша |
| | Гілевіч | | Пашкевіч |
| | Дудараў | | Шамякін |
| | Барадулін | | Быкаў |
| | Дубоўка | | Атраховіч |

**Заданне 10.** Суаднясіце паняцці і прыведзеныя значэнні. Запішыце адпаведныя лічбы.

*(Максімальная колькасць балаў – **5**)*

| | |
|---|---|
| А. Алітарацыя<br>Б. Метафара<br>В. Перыфраза<br>Г. Антытэза<br>Д. Аксюмаран | 1) спалучэнне супрацьлеглых паняццяў, якія лагічна выключаюць адно другое;<br>2) семантычна непадзельны апісальны выраз, з дапамогай якога перадаецца сэнс іншага слова ці выразу;<br>3) паўтор у вершаванай мове зычных гукаў;<br>4) супрацьпастаўленне;<br>5) параўнанне аднаго прадмета з другім на аснове іх падабенства. |

А ___, Б ___, В ___, Г ___, Д ___.

# Тэмы вусных выказванняў

## XI клас

### Білет 1

1. У Беларусі 2018 год – Год малой радзімы.

2. Кніга, якую я раю прачытаць кожнаму.

### Білет 2

1. Літаратурны твор, які мяне ўразіў.

2. Беларусь сінявокая – азёрны край.

### Білет 3

1. Усё мае свой працяг жыцця,
   Апроч няпраўды.
   *Максім Танк*

2. Дзякуй табе, дарагая матуля!

### Білет 4

1. Нясвіж і Мір – сусветная культурная спадчына ў спісе ЮНЕСКА.

2. Прапрадзедаў маіх жывая мова –
   Майго народа першая аснова,
   Душы яго шырокі, чысты свет!
   *Еўдакія Лось*

### Білет 5

1. О, мова матчына пявучая!

2. Густая, нібы мёд, іскрыстая, як сонца!
   *Эдуард Валасевіч*

## Білет 6

1. Можа, мала сябры
   Яшчэ знаюць наш край…
   *Максім Танк*

2. У нашым класе, у нашай школе ёсць такія традыцыі…

## Білет 7

1. Купала і Колас…
   Раптоўна
   Адчуеш свабодна зусім –
   Не толькі радком загалоўным –
   Ты ўсім абавязаны ім.
   *Рыгор Семашкевіч*

2. Родны мой горад. (Родная мая вёска.)

## Білет 8

1. Слынныя асобы Бацькаўшчыны.

2. З легендаў і казак былых пакаленняў…
   *Максім Танк*

## Білет 9

1. Колькі вызнаў і вынес ты, краю мой мілы!
   *Генадзь Бураўкін*

2. Мая любімая казка.

## Білет 10

1. Архітэктурныя помнікі Беларусі.

2. Самы светлы талент – дабрата.
   *Сяргей Грахоўскі*

## Білет 11

1. Веды і дабрачыннасць як свечка, што асвятляе чалавеку шлях і не дае заблукаць.

*Сымон Будны*

2. Люблю цябе і слухаю, прырода, такая блізкая парой любой!

*Васіль Жуковіч*

## Білет 12

1. Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
   Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў…

*Якуб Колас*

2. Калі я скончу школу…

## Білет 13

1. Ёсць чары у забытым, старадаўнім…

*Максім Багдановіч*

2. Магутнае слова ты, роднае слова!

*Янка Купала*

## Білет 14

1. Музыка ў маім жыцці.

2. Свет нас прымаў як народ
   Па адной палачанцы.

*Данута Бічэль*

## Білет 15

1. Там, дзе я жыву, варта паставіць помнік…

2. Чалавек – гэта цэлы свет.

*Кузьма Чорны*

## Білет 16

1. Мае бацькі – мае настаўнікі ў жыцці.

2. Я толькі што памёр. І ў гэты час
   Аддаў табе, зямля, сябе самога,
   Каб ведала, як я цябе люблю.
   *Уладзімір Караткевіч*

## Білет 17

1. Прырода – найцікавейшая кніга.
   *Якуб Колас*

2. Я родам з Адраджэння. Ды цяпер
   Усім часам, прасторам я належу.
   *Мікола Арочка*

## Білет 18

1. Бедны той, хто не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.
   *Цётка*

2. У Беларусі – ясныя вочы,
   Многа любові ў грудзях:
   Звонкае поле,
   Звонкія сосны,
   Звонкі і сонечны шлях.
   *Пятрусь Броўка*

## Білет 19

1. Біблія – дзівосная рака…
   *Францішак Скарына*

2. Жыццё даецца, каб жыццё тварыць…
   *Анатоль Вярцінскі*

## Білет 20

1. Чалавеку патрэбна не слава…
   *Сяргей Грахоўскі*

2. Мінулае вучыць нас, як жыць сёння.
   *Ян Баршчэўскі*